# УРОК БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ Ў VIII КЛАСЕ

## АДНАРОДНЫЯ ЧЛЕНЫ СКАЗА

**Л. М. ЦЯРЛЕЦКАЯ,**

настаўнік беларускай мовы і літаратуры

СШ №12 г. Пінска

Гэты ўрок з'яўляецца першым па раздзеле "Ускладнены сказ". Урок быў пабудаваны з улікам узроставых асаблівасцяў вучняў і ступені сфарміраванасці ў іх агульнавучэбных уменняў. Для вырашэння пастаўленых задач вучням былі прапанаваны разнастайныя заданні. Вучэбны матэрыял для ўрока быў адабраны з метадычных дапаможнікаў па беларускай мове і літаратуры.

**Мэта ўрока:** удакладніць і пашырыць паняцце пра аднародныя члены сказа

**Задачы:**

1. Актуалізаваць веды вучняў пра аднародныя члены сказа.
2. Пазнаёміць з развітымі аднароднымі членамі; аднароднымі членамі, якія маюць рознае марфалагічнае выражэнне; з канструкцыямі, што маюць некалькі радоў аднародных членаў; з канструкцыямі, якія аднароднымі членамі не з'яўляюцца; пазнаёміць са сродкам выражэння спалучальных адносін – інтанацыяй, злучальнымі злучнікамі.
3. Садзейнічаць развіццю маўлення вучняў, іх камунікатыўных здольнасцей.
4. Садзейнічаць выхаванню пачуцця павагі да свайго народа праз адносіны да роднага слова, фарміраваць нацыянальную свядомасць вучняў, культуру маўлення.

**Абсталяванне:**

1. Рабочыя лісты ўрока з заданнямі
2. Запісы на дошцы
3. Табліца
4. Памятка "Аднародныя члены сказа"
5. Тэставыя заданні
6. Карткі для рэфлексіі
7. Мультымедыйная прэзентацыя.

**Эпіграф**:

**Скарб, які ніхто і ніколі адабраць у нас не можа, – гэта любоў да Айчыны, да свайго народа, да роднай мовы, да маці-прыроды. (ЦЁТКА)**

**ХОД УРОКА**

**I.Арганізацыйна-матывацыйны момант.**

**Настаўнік.** Добры дзень усім прысутным на ўроку. Спадзяюся, што сённяшні ўрок будзе добрым, плённым і карысным для ўсіх.

**II. Паведамленне тэмы і мэты ўрока**

**Настаўнік.** Сённяшнім урокам мы распачынаем вывучэнне новага раздзела ,,Ускладнены сказ”. Тэма нашага ўрока – ,,Сказы з аднароднымі членамі. Спосабы выражэння аднародных членаў. Сувязь аднародных членаў пры дапамозе злучнікаў і без злучнікаў”.




**Настаўнік:**

Мы ўспомнім усё, што вы ўжо ведаеце па гэтай тэме, і разгледзім новы матэрыял.

Перш-наперш давайце акрэслім мэты ўрока, тыя, якія адпавядаюць тэме сённяшняга ўрока.

ДАВЕДАЕМСЯ:

1.

2.

3.

НАВУЧЫМСЯ:

1.

2.

3.

**Настаўнік:**

Наш урок праходзіць напярэдадні Міжнароднага дня роднай мовы.

Дзень роднай мовы асаблівы для кожнай нацыі, кожнага народа, бо няма народа без мовы, няма мовы без яго носьбіта. З 2000 года 21 лютага ЮНЕСКА абвясціла Міжнародным днём роднай мовы, каб папярэдзіць знікненне асобных гаворак свету і захаваць моўную разнастайнасць. Ужо традыцыяй стала святкаванне Дня роднай мовы і ў нашай школе.

**Зварот да эпіграфа**

***Скарб, які ніхто і ніколі адабраць у нас не можа, – гэта любоў да Айчыны, да свайго народа, да роднай мовы, да маці-прыроды. (ЦЁТКА)***

Як вы думаеце, чаму падкрэслены словы “Айчыны”, “народа”, “мовы”, “прыроды”?

**III. Актуалізацыя раней набытых ведаў.**

**Настаўнік.**

Для ўзнаўлення ведаў па дадзенай тэме паспрабуйце адказаць на пытанні тэста (раздаюцца карткі з пытаннямі).

**Тэст**

1. Аднароднымі з’яўляюцца тыя члены сказа, якія:

а) адносяцца да аднаго і таго ж члена сказа і выконваюць адну і тую ж сінтаксічную функцыю;

б) звязаны паміж сабой злучальнай сувяззю;

в) адносяцца да аднаго і таго ж члена сказа, але выконваюць розныя сінтаксічныя функцыі.

2. Аднароднымі членамі сказа могуць быць:

а) толькі галоўныя члены сказа;

б) толькі даданыя члены сказа;

в) і галоўныя, і даданыя члены сказа.

3. Аднародныя члены сказа злучаюцца:

а) пры дапамозе падпарадкавальных злучнікаў ;

б) пры дапамозе інтанацыі пералічэння;

в) пры дапамозе злучальных злучнікаў і інтанацыі пералічэння.

*Адказы:* 1 а,б; 2в; 3в.

**IV. Паглыбленне ведаў па тэме. Тлумачэнне настаўніка.**

**Настаўнік.** Магу дадаць, што ў сказе можа быць ужыты не адзін рад аднародных членаў, а два і больш. Сёння мы разгледзім наступныя звесткі пра аднародныя члены сказа. Звернемся да апорнай схемы.




**Каментарыі да схемы**

Аднародныя члены сказа могуць быць развітыя і неразвітыя (звярнуць увагу на інтанацыю).

Аднародныя члены сказа могуць быць выражаны як адной часцінай мовы, так і рознымі.

У рад аднародных членаў могуць уваходзіць непадзельныя словазлучэнні і фразеалагізмы.

V. **Фізкультхвілінка на зняцце стомленасці вачэй .**

**Настаўнік.** Прыйшоў час адпачыць. Устаньце з-за сталоў. Павярніцеся ў бок акна. Заплюшчыце моцна вочы, расплюшчыце, паміргайце. Павядзіце вачыма ўправа, улева, уверх, уніз. Паглядзіце далёка ўперад. А цяпер вярніцеся на свае месца. Вас зноў чакае справа.

VI. **Адпрацоўка і карэкцыя ведаў.**

**Настаўнік.** Такім чынам, мы ўзнавілі ў памяці звесткі пра сказы з аднароднымі членамі, а цяпер прапаную папрацаваць над замацаваннем новай тэмы.

***Практыкаванне 227.***

Вазьмі ў сваё сэрца на схову родную ***мову, поле, луг*** каляровы, родны ***блакіт***.

- Падкрэсліце аднародныя члены як члены сказа.
- Вызначце развітыя і неразвітыя аднародныя члены сказа.
- Як звязаны аднародныя члены паміж сабой?

***Практыкаванне 224, тэкст 3***

Закаханы ў жыццё і кожную мушку,

Я іду каля хат і росных садоў.

І са мной размаўляюць зяркі і птушкі

На дзясятках і тысячах розных моў.

– Колькі радоў аднародных членаў у гэтым сказе?
– Як звязаны аднародныя члены паміж сабой?

***Практыкаванне 238, тэкст 1***

**VII. Кантрольна-ацэначны этап.**

Выкананне тэста на засваенне тэмы ( работа складаецца з пяці заданняў: ад першага да пятага ўзроўню, заданне кожнага ўзроўню ацэньваецца ў 2 балы)

**І варыянт**

1. Выберыце правільнае сцвярджэнне, якое з’яўляецца працягам фармулёўкі:

„ аднародныя члены сказа – гэта словы , якія адказваюць на адно і тое ж пытанне, з’яўляюцца аднолькавымі членамі сказа і …”

а) адносяцца да розных членаў сказа;

б) адносяцца да аднаго і таго ж члена сказа;
в) адзін падпарадкаваны другому.
2. Якую сінтаксічную ролю выконваюць у сказе выдзеленыя словы? Выберыце правільны варыянт адказу.
Люблю *бары, бярозкі* і *пушчы* яшчэ з ваеннай бежанскай пары.
а) дапаўненне;
б) азначэнне;
в) дзейнік.
3. Які са сказаў мае аднародныя члены?
А) Ля Браслаўскіх азёр гусі- лебедзі мыліся.
Б) Пячоркі і даліны купаюцца ў вясеннім сонцы.
1.  Вызначце сказ, у якім ёсць некалькі радоў аднародных членаў.
А) Дзень спякотны і вясёлы з песняй жніўнаю прыйшоў;
Б) Прабег па сэрцы і па кожнай жылцы пяшчотны, ласкавы вецярок.
5. Адзначце сказ, у якім ёсць развітыя аднародныя члены.
А) Туман то гусцеў, набываючы колер хмары, то радзеў, растаючы ў сонечным святле.
Б) Люблю сівых дубоў калоны, і соснаў стромкія ствалы, і мёду поўныя калоды.

**ІІварыянт**

1. Выберыце правільнае выказванне.
А) Аднародныя члены сказа адносяцца не да аднаго і таго ж слова.
Б) Аднародныя члены сказа залежаць адзін ад аднаго.
В) Аднародныя члены сказа адказваюць на адно пытанне і паясняюць адно і тое ж слова ў сказе.
2.  Якую сінтаксічную ролю выконваюць у сказе выдзеленыя словы?
*Шапаціць* мне штосьці жыта, хоць слоў *не гаворыць*.
а) акалічнасць;
б) выказнік;
в) азначэнне.
3.  У якім сказе ёсць аднародныя члены сказа?
А) Я выйду пагляджу, што там робіцца.
Б) Чалавек павінен падарожнічаць і ведаць тую зямлю, на якой нарадзіўся.
4.  Вызначце сказ, у якім ёсць некалькі радоў аднародных членаў сказа.
А) Лес корміць , грэе і дровамі, і сценамі хат, і проста так.
Б) Кожная жывая лісцінка і галінка прыслухоўвалася да іншых жывых істот.
5.  Адзначце сказ, у якім ёсць развітыя аднародныя члены сказа.
А) Там бярозы шэпчуць сарамлівыя, нясмелыя.
Б) З саду далятала то дзявочая прыпеўка, то выбух смеху, то пераліў звонкага гармоніка.

***Адказы:***
**І варыянт :** 1б, 2а, 3б, 4б, 5б.
**ІІ варыянт:** 1в, 2б, 3б, 4а, 5б.

**VIII. Падвядзенне вынікаў**

**IX. Дамашняе заданне: пар. 37, 38, запісаць сказы з аднароднымі членамі**

**X. Рэфлексія**

Як вы лічыце, ці справіліся мы з мэтамі, пастаўленымі ў пачатку ўрока?

**XI. Заключнае слова настаўніка.**

А закончыць наш урок я хачу вершам Віктара Шведа “Дзесяць запаведзяў”. І такім чынам далучыцца да яго наказу нам, беларусам.

Мову родную беражы,
Мовай роднай даражы,
Мову родную шануй.
Мовай роднай не гандлюй.
Мову родную любі.
Мову ў сэрцы не губі.
Мовы роднай не кідай.
Мову дзецям перадай.
Мовы не аддай на здзек..
Толькі з ёй жыць будзем век.
***Дзякуй за працу, усяго вам найлепшага..***